Г. В. Відзіліна

# РОЛЯ Я. РАДЗІВІЛА Ў ПАДПІСАННІ КЕЙДАНСКАЙ УНІІ 1655 Г.

*Разглядаюцца малавядомыя падзеі гісторыі Беларусі, звязаныя з падпісаннем Кейданскай уніі са Швецыяй.*

Летам 1655 г. складанае знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай, якая вяла вайну з Расіяй і казакамі, было абцяжарана неабходнасцю змагання з яшчэ адным моцным праціўнікам – Швецыяй. Пры пошуках выйсця перавага была аддадзена дыпламатыі. Пагроза страты Вільні летам 1655 г. падштурхнула вялікага гетмана ВКЛ Януша Радзівіла і яго стрыечнага брата Багуслава распачаць кантакты са шведскім каралём. Позірк у бок Швецыі быў кінуты невыпадкова. Абодва Радзівілы былі пратэстантамі і шукалі паразумення з адзінаверцамі. Акрамя таго, з 1650г. Януш Радзівіл меў наладжаныя кантакты са шведскім губернатарам правінцыі Лівонія Магнусам Габрыэлем Дэлагардзі, які ў канцы ліпеня 1655 г. выступіў ініцыятарам перагавораў. Радзівілы выслалі ў Рыгу свайго прадстаўніка на перамовы, пагаджаючыся з прапановай караля Карла X Густава разарваць унію з Польшчай і перадаць ВКЛ пад уладу караля Швецыі, якога яны прызнавалі вялікім князем літоўскім. Аднак пакуль вяліся перамовы, 8 жніўня 1655 г. рускія і ўкраінскія войскі ўзялі Вільню. У змяніўшыхся умовах шляхта ВКЛ пачала больш крытычна ставіцца да шведскіх прапаноў. 17 жніўня 1655 г. была падпісана Кейданская дэкларацыя, у якой саслоўі ВКЛ пагадзіліся заключыць са Швецыяй ваенную канвенцыю і дзяржаўную ўнію на ўласных умовах. У тэксце яе 12 артыкулаў шведскія прапановы былі значна перапрацаваны і дапоўнены. Большасць уплывовых ураднікаў, што падпісалі Кейданскую дэкларацыю, складалі пратэстанты Гэты дакумент быў спробай кампрамісу паміж апазіцыяй на чале Радзівіламі і партыяй раялістаў на чале з Гасеўскім. Дэкларацыя не была ратыфікавана Швецыяй. Магнаты і шляхта ВКЛ супярэчліва паставіліся да пагаднення, падпісанага 17 жніўня 1655 г. Ліцвінскае войска раскалолася яшчэ да падпісання Кейданскай дэкларацыі. 14 жніўня 1655 г. ад Януша Радзівіла адышла частка войска, якая была не згодная з яго палітыкай, і стварыла канфедэрацыю супраць Радзівіла і Швецыі ў Вярбілаве на Падляшшы. Узначалілі канфедэрацыю асабістыя ворагі Януша Радзівіла віцебскі ваявода Павел Ян Сапега і польны гетман Вінцэнт Гасеўскі. Разам з тым, з удзелам Дэлагардзі ў Кейданах працягваліся складаныя перагаворы, пакуль 20 кастрычніка 1655 г. не быў прыняты новы тэкст пагаднення. Паводле Кейданскай уніі, шведскі кароль Карл X Густаў прызнаваўся вялікім князем літоўскім, усе папярэднія ўніі з Польшчай скасоўваліся. Наступнікі шведскага караля аўтаматычна станавіліся вялікімі князямі літоўскімі, ВКЛ і Жамойць захоўвалі аўтаномію, любыя змены законаў з боку караля Швецыі павінны былі замацоўвацца на вальным сойме. У ВКЛ захоўвалася свабода веравызнання і ўсе правы хрысціянскіх цэркваў. Кароль Швецыі стаў галоўнакамандуючым войска ВКЛ, меў прырагатывы заключаць мір і аб'яўляць вайну. ВКЛ пагаджалася ваяваць супраць Польшчы. Умовы Кейданскай уніі падпісалі 1172 прадстаўнікі ВКЛ. Унія не была ратыфікавана каралём і соймам Швецыі, але мела рэальную сілу на поўначы ВКЛ і стала адной з прычын разрыву Расіяй міру са Швецыяй у ліпені 1656 г. У лістападзе 1655 г. на Падляшша ваяваць з канфедэратамі накіраваўся Януш Радзівіл. Ён заняў горад Тыкоцін у Польшчы, дзе хутка быў абложаны войскамі Паўла Яна Сапегі. Там 31 снежня 1655 г. 43- гадовы вялікі гетман нечакана памёр. Вясной 1656 г. жамойцкая шляхта паўстала і выцесніла нешматлікія шведскія гарнізоны ў Лівонію. Кейданская ўнія канчаткова страціла сілу.

Такім чынам, спроба палітычных колаў ВКЛ знайсці выхад са стану крызісу, выкліканага паражэннямі ў вайне з Расіяй, атрымала ўвасабленне ў Кейданскай уніі са Швецыяй, заключанай 20 кастрычніка 1655 г. Яе ўмовы не былі такімі раўнапраўнымі, як зараз спрабуюць паказваць некаторыя даследчыкі.

### *Спіс літаратуры*

1. Катлярчук, А. Кейданская унія 1655/ А. Катлярчук // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. – Мінск: БелЭн, 2006. – Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч/ Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. З.Э Герасімовіч. – С. 83 – 84.

*Видилина Анна Витальевна*, студентка ФКП БГУИР, annavidilina1@gmail.com
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, зав.кафедрой гуманитарных дисциплин, к. и. н., доцент.